ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 35 (263) 4 кастрычніка — 11 кастрычніка 2002 г.

СТАР. 7-8
TV ПРАГРАМА 7 кастрычніка –13 кастрычніка

СТР.3–4
БЕЛАРУСЬ В ЦИФРАХ
анализируют журнал «Экономист» и наш корреспондент

СТР. 5
КОНЕЦ ЛЕЙБОРИСТСКОГО ГИПНОЗА
наступает в Англии, если так считает наш берлинский автор

СТР. 6
ЧТО НАША ЖИЗНЬ? — ИГРА!
на вопросы нашего корресподента отвечает Валентина Голубева из «Что? Где? Когда?»

БЕЛАРУСКІЯ ПЫТАНЬНІ

ЯКАЯ БЕЛАРУСЬ ТРАПЛЯЕ Ў ЭЎРОПУ



ЮРАСЬ ЗЯНКОВІЧ

На мінулым тыдні ў Стразбургу прайшла чарговая сэсія Парляманцкай асамблеі Рады Эўропы. Сярод іншых важных пытаньняў, вынесеных у парадак дня сэсіі, значылася таксама аднаўленьне статусу сьпецыяльна запрошанай для Беларусі. Удзел у сэсіі бралі дзьве дэлегацыі: ад Нацыянальнага сходу і ад апазыцыі.

Гісторыя стасункаў Беларусі і Рады Эўропы пачалася ў 1992 годзе, калі былі ўсталяваныя першыя кантакты. 12 сакавіка 1993 году Беларусь накіравала афіцыйную просьбу пра прыняцьце яе ў склад Рады Эўропы. У сувязі з гэтым нашай краіне быў прадстаўлены статус сьпецыяльна запрошанай.

Аднак далейшае разьвіцьцё падзеяў паставіла крыж на стараньнях нашай краіны. 13 студзеня 1997 году ў адказ на дзяржаўны пераварот у Беларусі Парляманцкая асамблея пазбавіла Беларусь статусу сьпецыяльна запрошанай, а прэзыдэнт асамблеі сказаў, што *«новая канстытуцыя незаконная, а шлях, якім быў сфармаваны новы парлямант, пазбаўлены дэмакратычнай легітымізацыі»*.

З таго часу ўзаемаадносіны Беларусі і Рады Эўропы будаваліся на тым, што ўлады любымі шляхамі стараліся аднавіць свой статус, а апазыцыя імкнулася пераканаць эўрапэйскіх парлямантараў у тым, што зь беларускім рэжымам нельга мець нічога агульнага.

Пасьля мінулагадовых прэзыдэнцкіх выбараў Рада Эўропы, як і астатнія эўрапэйскія структуры, прызнала выбары нелегітымнымі й сфальсыфікаванымі. Але разам з тым было прызнана, што палітыка ізаляцыі Беларусі не прынесла якіх-небудзь станоўчых эфэктаў. У рэчышчы гэтага напярэдадні сэсіі пытаньне пра аднаўленьне статусу сьпецыяльна запрошанай магло стаць зноў актуальным, а ў гэтым выпадку рэжым Лукашэнкі меў бы рэальныя шанцы набыць міжнародную легітымізацыю.

Дзеля ўдзелу ў сэсіі былі запрошаныя вядомыя ў Беларусі палітыкі Анатоль Лябедзька, Валянціна Палевікова і Уладзімір Нісьцюк. Аднак напярэдадні ад'езду Кансультацыйная рада апазыцыйных палітычных партыяў (КРАПП) прыняла рашэньне, што дзеля лепшай рэпрэзэнтацыі пазыцыяў партыяў у працы сэсіі возьме ўдзел старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка, які выступіць з адмысловым дакладам і выкладзе пункт гледжаньня ўсяго КРАПП.

Асноўным дакладчыкам па Беларусі, як і ў мінулыя гады, быў Вольфганг Бэрэндт, дэпутат нямецкага парляманту. Ягоны даклад заўсёды мае вырашальнае значэньне, бо фармуе пазыцыю Рады Эўропы. Менавіта таму Бэрэндта заўсёды горача вітаюць у Менску як у офісах апазыцыйных партыяў, гэтак і ў вядомым будынку на вуліцы Карла Маркса.

На гэты раз нямецкі дэпутат асноўныя акцэнты расставіў на тым, што ў Беларусі па-ранейшаму парушаюцца правы чалавека. Але разам з тым у дакладзе Бэрэндта прагучалі й ноткі, прыемныя рэжыму: на яго думку, Палата прадстаўнікоў паступова трансфармуецца ў паўнавартасны парлямант, хаця яе парлямантам усё яшчэ называць рана.

Высновы спадара Бэрэндта падтрымалі ўсе ўдзельнікі дыскусіі, акрамя двух чалавек: лідара расейскіх камуністаў Генадзя Зюганава і прадстаўніцы «палаткі» Зінаіды Пяньковай, якая сказала, што «палатка» ўжо зусім хутка станецца парлямантам (цікава, а чым яна ёсьць, на яе думку, сёньня?). Адваротны бок беларускай праблемы прадставіў у сваім выступе Вінцук Вячорка. Ён акцэнтаваў увагу эўрапэйскіх парлямантараў ня толькі на тых пытаньнях, што ўжо вядомыя ў сьвеце, але і на тых, пра якія ўсе чулі ў Беларусі, але якія заставаліся невядомымі на Захадзе: праблемы рэлігійных меншасьцяў у выпадку прыняцьця закона «Пра свабоду веравызнаньня» і праблема моўнай дыскрымінацыі беларускамоўных беларусаў. Гэтыя аспэкты сталіся сапраўдным адкрыцьцём у тым ліку для нашых бліжэйшых суседзяў з Польшчы, Літвы ці Латвіі. Зрабіла на Раду Эўропы ўражаньне таксама інфармацыя пра перасьлед прэсы ў Беларусі і пра фізычную расправу зь беларускімі палітыкамі і грамадзкімі дзеячамі цягам апошняга месяца.

Як аказалася, у Эўропе таксама ёсьць сумненьні наконт таго, ці хочуць беларусы мець уласную дзяржаву. На поўным сур'ёзе прадстаўнікам Беларусі прапаноўвалі будаваць дэмакратыю ў межах Расеі, і вельмі зьдзіўляліся, даведаўшыся, што ў нашай краіне да гэтай ідэі вельмі неадназначнае стаўленьне. І зноў, у які ўжо раз, узгадваюцца прозьвішчы тых, хто дагэтуль прадстаўляў беларускую апазыцыю на міжнародных форумах: Лябедзька, Нісьцюк, Палевікова. Яны добра ведаюць, што сапраўдная дэмакратычная апазыцыя не жадае бачыць Беларусь у складзе Расеі? А калі так, то чаму гэты пункт гледжаньня так кепска гучыць на міжнародных форумах? Гэта яшчэ раз падкрэсьлівае, што, відаць, апазыцыйным партыям трэба нешта тэрмінова мяняць у галіне зьнешняй палітыкі.

Парлямантары нядоўга дыскутавалі над беларускай праблемай, таму што з большага і так усё ўсім зразумела: дэпутаты «палаткі» не атрымаюць горача жаданага квітка ў залю Рады Эўропы. Аднак цікавымі і лёсавызначальнымі для Беларусі стануць кадравыя зьмены: цяпер сьпецдакладчыкам па Беларусі стане этнічны беларус, дэпутат літоўскага сойму Вацлаў Станкевіч. Створаная таксама сьпецкамісія па рассьледаваньню справаў зьніклых палітыкаў, якую ўзначаліў іншы этнічны беларус Сяргей Кавалёў. Між іншым, з падачы Вячоркі сьпіс зьніклых палітыкаў папоўніўся яшчэ адным прозьвішчам: Рада Эўропы даведалася, што яшчэ ў лютым гэтага году ў Віцебску зьнік мясцовы лідар БНФ Юрась Корбан, пра што дагэтуль прадстаўнікі беларускай апазыцыі – а дакладней кажучы, Аб'яднанай грамадзянскай партыі, – што езьдзілі ў Эўропу, чамусьці ня ўзгадвалі. Відаць, партыйная прыналежнасьць адбіваецца нават на вырашэньні агульных для ўсёй апазыцыі праблемаў.

Не пасьпелі сьціхнуць дэбаты ў Стразбургу, а два з чатырох прадстаўнікоў беларускай апазыцыі – Вячорка і Лябедзька – ужо сьпяшаліся ў Прагу, дзе распачынала працу IV канфэрэнцыя цэнтральна-эўрапэйскіх правацэнтрысцкіх партыяў. Там таксама абмяркоўвалася беларускае пытаньне, але гэтым сёньня ўжо нікога ня зьдзівіш. Важна іншае: памочнік дарадцы прэзыдэнта ЗША па зьнешняй палітыцы Бары Джэксан перадаў адмысловае прывітаньне ўдзельнікам канфэрэнцыі ад Джорджа Буша-малодшага. Акрамя звычайных для такога дакумента словаў, узгадвалася таксама адзіная праблема, якая хвалюе ЗША у Эўропе найбольш: праблема дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. Гэтаму пытаньню прэзыдэнт ЗША прысьвяціў амаль траціну свайго прывітаньня. Па ўсім відаць, што зуб на беларускі рэжым вырастае ня толькі ў Крамля, але і ў Белага дому. Засталося толькі, каб гэта ўсьвядомілі палітыкі ў Менску і пачалі шукаць шлях да сэрцаў звычайных беларускіх выбаршчыкаў. ■

ПОЛИТЭКОНОМИКА

Забастовка с перспективой на работу

СЕРГЕЙ ПУЛЬША, *naviny. by*

Бессрочная забастовка предпринимателей с прекращением выплаты налогов началась.

На минском стадионе «Динамо» бастует большинство предпринимателей. Не поддержали забастовку лишь единицы, торговые палатки которых на пустом рынке выглядят, мягко говоря, смешно и нелепо. Остальные, заплатив стадиону за аренду торговых мест, на работу вышли – без товара и без палаток.

Все, что сейчас происходит на одном из крупнейших рынков Минска, можно назвать стихийным митингом. Меньшинство, не поддерживающее забастовку, не только торгует. Есть и такие, которые не выставили свои палатки, но пришли на стадион, чтобы попытаться переубедить остальных в полной невыгодности этой забастовки самим предпринимателям. Вокруг таких людей и вокруг телекамер российских каналов разворачиваются жаркие споры. Аргументы людей, не поддержавших стачку, просты: мы бастуем в убыток себе – за нас работает торговля.

Однако предварительные результаты бессрочной забастовки предпринимателей, по мнению одного из лидеров забастовочного движения Валерия Левоневского, обнадеживающие:

– Результат очень неплохой. Гродно и Гродненская область бастуют полностью. Очень активно бастуют областные центры, особенно в западном регионе, причем они бастуют с неуплатой налога. Во многих небольших городах налогов не заплачено 90-95 процентов. Кстати, в Гродно забастовку поддержали и таксисты.

– Все проблемы созданы Александром Лукашенко и его системой управления. Если бы он захотел, он бы эту проблему решил в течение трех минут. Если бы захотел, издал декрет или указ и вернул бы все на место – скажем, по состоянию на май 2002 года.

Окончание на стр. 2 ➲

ФОРС-МАЖОР

Наводнение размыло чешское правительство

ОКСАНА КУЗЬМИЧ

Неспособность чешского правительства определиться со способами ликвидации последствий августовского наводнения ставит под вопрос его жизнеспособность в течение четырехлетнего срока.

Реки в Чехии уже давно вернулись в свои русла, а проблемы, принесенные наводнением, еще долго будут о себе напоминать. В конце сентября чрезвычайное положение закончилось почти во всех пострадавших от наводнения территориях. Между тем, в Праге в районе Карлова моста оно продлится еще весь октябрь. Пражское метро будет полностью восстановлено только к марту следующего года. Мало того, что наводнение нанесло Чехии ущерб, доходящий, по текущим подсчетам, до 90 миллиардов крон. Теперь еще и правительству из-за его последствий грозит перетасовка.

В сентябре правительство пересмотрело налоги на 2003 год. В предложенном им пакете мер было предусмотрено повышение подоходного налога, а также минимальной ставки налога на добавленную стоимость. Таким способом предполагалось получить дополнительных 10 миллиардов крон, или 322,8 миллиона долларов США. Хотя полученные средства и не дотягивали и до половины необходимой суммы, они стали предметом раздора в правительстве.

Как ни странно, повышению налогов воспротивились правые. 13 сентября против правительственного пакета налоговых изменений проголосовал Свободный объединенно-демократический союз (*US-DEU*) в лице спикера Палаты депутатов Ганы Марвановой. Выступив за одно с оппозиционной Гражданской демократической партией (*ODS*) и Коммунистической партии Богемии и Моравии (*KSCM*), член правительства Марванова заблокировала решение кабинета.

Окончание на стр. 4 ➲

АНЕКДОТ-С

На уроке пения:
– Как тебе, Вася, нравится наш новый государственный гимн?
– Очень нравится!
– Молодец, садись, «пять».
– А тебе, Маша?
– Совсем не нравится.
– Молодец, садись, «десять». Мне он тоже не нравится.

***

– Александр Григорьевич, рейтинг упал!
– Ну и имена же пошли у этих оппозиционеров.

НАВІНЫ

Сябры. Эмбарга супраць Іраку павінна быць знятае, агучыў пазіцыю беларускага боку ў гэтым пытанні кіраўнік беларускай часткі сумеснай камісіі па гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву Леанід Козік. Адказваючы на пытанні журналістаў, ён паведаміў, што падчас візіту на Беларусь іракскай дэлегацыі пытанні ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва не абмяркоўваліся, гаворка ішла толькі пра супрацоўніцтва ў галіне эканомікі, аховы здароўя, адукацыі. Сярод іншага, беларускі бок распрацаваў сістэму кіравання нафтавымі радовішчамі Іраку, практычна гатовая дамова пра будаўніцтва ў гэтай краіне завода для вытворчасці рухавікоў.

Ацяпленне. Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі паабяцаў, што ацяпляльны сезон пачнецца, як толькі 5 дзён запар сярэднесутачная тэмпэратура будзе ніжэйшая за 8 градусаў па Цэльсію. Рашэнне ўключыць ацяпленне будуць прымаць аблвыканкамы ды Мінскі гарвыканкам. Міністр рэкамендаваў уключыць цяпло дзіцячым садкам, школам ды лякарням з 1 кастрычніка. Між тым, кошт камунальных паслуг у ацяпляльны сезон значна ўзрасце: да прыкладу, плата за 3-пакаёвую кватэру будзе складаць каля 30 *USD* за месяц.

Пасведчанне. Журналіст Мікола Маркевіч, які адбывае пакаранне на «хіміі», атрымаў пасведчанне асуджанага № 406 – адзіны дакумент, які на працягу наступных 1,5 год будзе пацвярджаць ягоную асобу. На гэтым тыдні ён мусіць прапісацца па адрасе асіповіцкай «хіміі». Адміністрацыя ўстановы пакуль не адпускае яго наведаць сям'ю, бо не атрымала па пошце адпаведнага дазволу.

Бартэр. Рада міністраў абмяжоўвае бартэр у разліках рэспубліканскіх структураў. Так, для большасці прадпрыемстваў бартэрам дазволена аплачваць ад 5% да 10% спажытых энергарэсурсаў. Структурам Міністэрства прамысловасці выкарыстанне бартэру ў разліках за энерганосьбіты вызначана максімум 30%, «Белнафтахіму» – 25%, «Беллегпраму» – 40%. Аднак з прычыны адсутнасці «жывых» грошай беларускія прадпрыемствы з неахвотаю пазбаўляюцца бартэру: з пачатку гэтага года аплата грашыма за спажыты прыродны газ узрасла толькі на 7%. Па стане на 1 верасня беларуская запазычанасць расійскім вытворцам газу складае 258 мільёнаў *USD*.

Запазычанасць. Запазычанасць па заработнай плаце ў цэлым па Беларусі на 31 жніўня склала 88,5 мільярда рублёў, прырост яе за месяц склаў 16,8 мільярда. Як паведамілі ў Міністэрстве эканомікі, самая высокая запазычанасць па заробках назапасілася ў сельскагаспадарчых арганізацыях – яе ўдзельная вага ў агульнай суме нявыплачаных заробкаў склала 74 адсоткі.

Кошты. На 23 адсоткі ў параўнанні са снежнем мінулага года вырас індэкс спажывецкіх коштаў на ўсе тавары і паслугі ў сёлетнім жніўні. Пры гэтым харчовыя тавары падаражэлі на 16,8 адсотка, нехарчовыя – на 16,5. Як паведамілі ў Мінстатыстыкі, плата за паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі цягам гэтага перыяду вырасла больш як на 117 адсоткаў, за электрычнасць – амаль на 57, водазабеспячэнне – на 72, за карыстанне жылымі памяшканнямі – на 423 адсоткі.

Піва. Кампанія «*Пивоварни Ивана Таранава*» вядзе перамовы аб набыцці бабруйскага бровару «Дзеднава». Днямі сход акцыянераў беларускага прадпрыемства ўхваліў уваходжанне *ПИТ* у лік акцыянераў. Кампанія *ПИТ*, уключаная ў заснаваны амерыканцамі холдынг *Detroit Brewing*, разлівае піва пад маркамі «*ПИТ*», «*Три медведя*», «*Goesser*» і «*Доктор Дизель*». Холдынг аб'ядноўвае тры заводы – у Калінінградзе, Наватроіцку і Хабараўску. Магутнасці бабруйскага бровару складаюць 4 мільёны дэкалітраў. Асноўныя акцыянеры прадпрыемства – дзяржава і працоўны калектыў. «Дзеднава» ператворыцца ў ЗАТ «Беларуская піваварная кампанія». Інвестары гатовыя выкласці 2 мільёны даляраў на закуп акцыяў прадпрыемства і яшчэ 10 мільёнаў інвеставаць у будаўніцтва новых магутнасцяў.

Цыгарэты. Гарадзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» пачала выпуск новага класу цыгарэт. Яны розняцца ад папярэдніх памерамі – на 4 міліметры даўжэйшыя. З 19 верасня на прадпрыемстве пачаўся выпуск цыгарэт «Мінск», «Магнат» і «Прэм'ер» даўжынёй 84 міліметры і новы гатунак пад назвай «Белая Русь». Гэтыя цыгарэты патрабуюць большых выдаткаў на паперу і тытунь. Іх кошт розніцца ад папярэдніх прыкладна на 12 адсоткаў. Да прыкладу, цыгарэты «Мінск» даўжынёй 80 міліметраў каштуюць 536 беларускіх рублёў, а даўжынёй 84 міліметры – 601 рубель. У вольным продажы гораду і краіны цыгарэты з'явіліся з 23 верасня. Кошты на тытунёвыя вырабы фіксаваныя і ўсталёўваюцца Міністэрствам фінансаў. Таксама прадугледжана штомесячнае паўтара-двухадсоткавае павышэнне коштаў.

Партыі. 30 верасня БелТА са спасылкай на прэсавую службу Міністэрства юстыцыі распаўсюдзіла інфармацыю аб адмове Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі у рэгістрацыі. Кіраўніцтва партыі, якое не атрымлівала ніякіх афіцыйных рашэнняў, звярнулася ў Мінюст за тлумачэннямі. Са словаў загадчыка адпаведнага ўпраўлення сп. Сухініна і юрыста гэтага ж упраўлення сп. Матвеева высветлілася, што інфармацыя БелТА не адпавядае рэчаіснасці і Матвееву вядзенне справы аб рэгістрацыі АСДП даручана толькі 1 кастрычніка, а на экспертызу дакументаў яму спатрэбіцца не менш за тыдзень. Што за гэтым: бюракратычная блытаніна ці правакацыя, прафесійная неахайнасць міністэрскай прэсавай службы і БелТА ці свядомая «*утечка информации*» з мэтай падрыхтоўкі глебы пад ужо прадвырашаную адмову ў рэгістрацыі? Кіраўніцтва АСДП не выключае апошняга, асабліва калі прыняць пад увагу той супраціў, які аказваюць улады і пэўныя палітычныя сілы працэсу аб'яднання сацыял-дэмакратаў і кансалідацыі дэмакратычнай апазіцыі.

Між тым, АСДП не губляючы часу, распрацэс стварэння сваіх структур у рэгіёнах. Першымі стартавалі віцебскія сацыял-дэмакраты (БСДП, БСДГ, жаночай партыі «Надзея» і новапрынятыя), якія 29 верасня правялі ўстаноўчы сход гарадской арганізацыі.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ

«Уборка за иностранцами в гостиницах и ресторанах заставляет испытывать унижение»

(Т. Гусельникова, «Советская Белоруссия», 2.10.02)

«А у господина Ухтинского большое настоящее»

(Ю. Ананич, «Минский курьер», 2.10.02)

«Тормозить с законами – дело дорогое и сомнительное»

(Э. Малофеев, «Республика», 2.10.02)

АКЦЫЯ

Наш адказ Пуціну

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

1 кастрычніка ініцыятары акцыі пад лозунгам «За незалежнасць! Беларускі народ — гаспадар сваёй краіны!» абвясцілі пра стварэнне аргкамітэта. Шэсце і мітынг павінны адбыцца ў Мінску 17 лістапада. Месца збора — плошча Якуба Коласа, 12.00.

У склад аргкамітэта ўвайшлі прадстаўнікі Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі, Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, Партыі БНФ, Ліберальна-дэмакратычнай партыі, Беларускай партыі свабоды, Маладога фронта і Партыі камуністаў беларускай. Яе пасланцы, дарэчы, на апошнім паседжанні рабочай групы не прысутнічалі, таму, магчыма, спатрэбіцца ўзгадненне пазіцый. АГП, як было паведамлена на прэс-канферэнцыі ў аўторак, дасць адказ аб сваім удзеле ў суботу.

Партыя працы не ўдзельнічала ў паседжаннях ініцыятыўнай групы, але акцыю збіраецца падтрымаць. Тое ж самае заявілі БСДГ (НГ) і Хартыя'97 з умовай, што мітынг і шэсце будуць адбывацца ў цэнтры сталіцы. Менавіта аб гэтым арганізатары акцыі і заявілі на прэс-канферэнцыі: пры любым адказе гарвыканкама яны не пагодзяцца на задворкі. Да супрацы далучацца (аб гэтым ужо дамоўлена) і дэмакратычныя прафсаюзы, а таксама няўрадавыя арганізацыі.

Акцыя праводзіцца ў абарону незалежнасці краіны. Па словах кіраўніка БНФ Вінцука Вячоркі, наспеў час прадэманстраваць гатоўнасць беларускага грамадства абараняць суверэнітэт дзяржавы. Акрамя таго ініцыятары акцыі маюць намер выступіць і супраць сацыяльна-эканамічнай палітыкі ўладаў, якая прыводзіць да збяднення і жабрацтва.

Арганізатары паведамілі таксама, што пасля лістападаўскага шэсця стартуе кампанія, звязаная з выбарамі ў мясцовыя саветы, якая скончыцца масавай акцыяй на Дзень волі 25 сакавіка.

Вынікамі кампаніі павінны стаць недапушчэнне правядзення рэферэндуму аб аб'яднанні Беларусі і Расіі, стварэнне дэмакратычных умоваў для выбараў, а таксама трывалай кааліцыі дзеля абароны незалежнасці Беларусі і перамогі апазіцыі на выбарах – як на парламенцкіх, так і на прэзідэнцкіх.

Як заявіў лідэр Маладога фронта Павел Севярынец, моладзь прыме ў акцыі самы актыўны ўдзел. Адказ маладых на прапановы Пуціна інкарпараваць Беларусь, па словах Паўла, будзе «*вельмі рашучы*» і «*канкрэтны*». ■

СЪЕЗД

Президент меньшинства

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

В сентябре нынешнего года Независимый институт социально-экономических и политических исследований провел очередной национальный опрос общественного мнения. Методом *face-to-face interview* опрошено 1509 человек в возрасте 18 лет и старше, предельная ошибка репрезентативности не превышала 0,03 процента.


Тихо и незаметно для своих сторонников и для самого себя Александр Лукашенко окончательно стал президентом меньшинства. Большинство же белорусов с некоторых пор довольно скептически относятся к его способностям править страною и людьми.

Не слишком пристрастные социологические исследования свидетельствуют, что с каждым месяцем остается все меньше тех, кто готов голосовать за Александра Лукашенко на новых президентских выборах. Так, по данным НИСЭПИ, теперь лишь 27 процентов опрошенных готовы доверить действующему президенту роль вечного главы государства, неограниченное число раз продляющего свои полномочия. Столько респондентов лично вписали в анкету имя Александра Лукашенко, отвечая на так называемый открытый вопрос социологов.

Для полноты картины социологи поинтересовались, кто и как склонен голосовать на вероятном референдуме о пересмотре конституционного срока пребывания у власти президента Лукашенко. Выяснилось, что за такое изменение Конституции намерены голосовать 15,5 процента опрошенных, а 25,4 пока не знают и собираются смотреть по обстоятельствам. Все остальные «против» с большей или меньшей степенью категоричности.

Заслуживают внимания и ответы на вопрос, удовлетворены ли респонденты тем, как президент Лукашенко управляет Беларусью. У 12,9 процента по-прежнему неизбывно чувство глубокого удовлетворения властью. 26,2 процента сомневаются в своей удовлетворенности. 20,7 процента власть еще частично удовлетворяет. А 36,5 процента правление Александра Лукашенко оставляет совершенно неудовлетворенным.

Так или иначе, абсолютное большинство не в восторге от деятельности Александра Лукашенко на посту президента. Меньшинство вроде бы довольно, но как-то не очень внятно. 28,6 процента твердых лукашенковцев готовы к «*интеграции путем вхождения Беларуси в состав России*». Никак согласны разжаловать своего суверена в заурядные российские губернаторы? Лишь бы уцелел он, его политика и его меньшинство. ■



ПОЛИТЭКОНОМИКА



Забастовка с перспективой на работу

➲ *Окончание. Начало на стр. 1*

Сейчас все министерства и ведомства выполняют его указание, которое он дал им прямо по телевидению: ищите деньги. Вот Министерство труда и социальной защиты изобрело страховые взносы, налоговая инспекция изобрела расчетные счета, Минэкономики внедряет кассовые аппараты.

– Сегодня предприниматель платит 120-200 тысяч рублей налога за себя и за каждого наемного работника. Покажите мне хоть одного служащего министерства, кто платит столько налога в бюджет?

– Если наши требования об отмене этих поборов не будут выполнены, это приведет к дальнейшей серии забастовок. Уже запланирована месячная забастовка на январь-февраль 2003 года.

Однако неясно: если запланированы дальнейшие акции протеста, сколько протянется забастовка, объявленная «*бессрочной*». Большинство предпринимателей в кулуарных разговорах высказывают мнение, что рынки начнут работать на четвертый-пятый день забастовки. Некоторые надеются, что за время забастовки правительство подсчитает недополученные налоги и начнет шевелиться, чтобы решить конфликтные вопросы как можно скорее. Таким образом, начавшаяся акция протеста носит, скорее, угрожающе-предупреждающий характер, чем попытку кардинально изменить ситуацию с правами предпринимателей в Беларуси. Даже, по мнению Валерия Левоневского, предприниматели должны начать работу как можно скорее:

– Через неделю многим предпринимателям не только налоги будет нечем заплатить, но и семью кормить нечем будет. Потому что деньги вложены в товар, который должен продаваться. Это оборотные деньги, и если они будут потрачены, – очень сложно будет снова открыть бизнес. Отмашкой для прекращения забастовки должно стать выступление премьер-министра, который скажет, что все нововведения отменены.

Подобное мнение о продолжительности забастовки предпринимателей высказал и сопредседатель республиканского общественного объединения «Частная собственность» Леонид Малахов:

– По моим прогнозам, выставки и ярмарки начнут работать завтра-послезавтра. Крупные рынки продержатся максимум до выходных. Дело в том, что, по моим данным, большой процент предпринимателей Минска все-таки проплатил налоги. Если бы они этого не сделали, то, может быть, забастовка была бы бессрочной.

– С другой стороны, мы ведем переговоры с правительством, наши предложения обсуждаются. Единственное, что конкретного ответа на наши требования мы пока не получаем. Наши главные соперники сейчас – Мингорисполком и министерство по налогам. Они, похоже, не понимают, что уничтожают тех, с кого собирают налоги. Мы собираемся все-таки им это объяснить.

ТЕНДЕНЦИЯ

ЗА НЕЛОЯЛЬНОСТЬ «ФЭЙСОМ» ОБ АСФАЛЬТ

АЛЕСЯ ГОРДИНА

На прошлой неделе на известного белорусского ученого Адама Мальдиса было совершено разбойное нападение. Это случилось спустя неделю после избиения одного из инициаторов создания Объединенной социал-демократической партии Алексея Короля. Лишь по счастливой случайности в тот самый день не пострадала руководитель этой партии Валентина Полевикова. Но этой участи несколько месяцев назад не избежал ее муж. Кто следующий?

В понедельник мы позвонили домой Адаму Мальдису, чтобы узнать о его самочувствии. Но поговорить не удалось. Родные сообщили, что Адама Иосифовича пришлось госпитализировать: оказались сломаны ребра. Об улучшении состояния пока говорить не приходится.

Этот случай как две капли воды схож с расправой над Алексеем Королем. То же время – 11 вечера, то же место – возле подъезда своего дома. Одинаковый почерк – удар с отключением сознания. В обоих случаях ничего ценного у пострадавших не было – личные и рабочие документы. Алексей Король отмечает и такую особенность: его, как и мужа Валентины Полевиковой, продолжали избивать и после потери сознания. Об этом свидетельствуют побои, которые пострадавшие обнаружили потом на своем теле.

3 сентября, когда избили Алексея Короля, Валентина Полевикова возвращалась с ним из поездки в Литву. Перед прибытием в Минск попросила своего сына встретить ее: помочь поднести сумку с продуктами. Сын пришел с двумя друзьями. Приехав к дому, он пошел с матерью в подъезд, а товарищи остались ждать на улице. И тут на друзей сына набросились два типа, завязалась драка. Когда они увидели, что сын Полевиковой возвращается обратно, нападавшие ретировались. Коллега по партии Валентины Тимофеевны в это же время валялся окровавленный возле своего подъезда.

Это и есть ответ на сомнения тех, кому в избиении Мальдиса не видится политический след: все, мол, дело рук подонков-уголовников, которых даже не остановил преклонный возраст уважаемого человека. В случае с Валентиной Полевиковой политическая версия превалирует. Что было бы, если бы Полевикова возвращалась одна, не хочется представлять. И если поднимается рука на неугодную женщину-оппозиционера, то и с варварской расправой над 70-летним ученым все становится на свое место.

Юрия Хащеватского, автора остропублицистического фильма «Обыкновенный президент», в свое время «вырубили» прямо в его мастерской. Он отмечает, что избиение руководителя Международной ассоциации белорусистов Адама Мальдиса произошло аккурат накануне судьбоносного съезда Союза писателей. Его участники, тем не менее, вновь засвидетельствовали свою оппозицию режиму. *«Эта власть не имеет никакой морали. Дали по голове пожилому человеку, чтобы продемонстрировать писателям, что ни перед чем не остановятся»*, – предполагает Хащеватский.

Все расправы становятся в один ряд и с избиением режиссера Валерия Мазынского, и жены журналиста Юрия Драгохруста, которой без обиняков передали угрозы мужу. Еще одного журналиста – Олега Бебенина – вывезли за город и там «воспитывали».

Алексей Король напомнил и об избиении активиста комитетов общественного самоуправления Ивана Анташкевича во время прошлогодних президентских выборов, отметив: *«Цепочка таких фактов предполагает политическую версию. Опровергнуть ее можно только активными следственными действиями и поимкой преступников. Но ни в одном случае виновных так и не нашли»*. По мнению Алексея Короля, несмотря на усиление репрессий после президентских выборов, избиения оппозиционеров свидетельствуют отнюдь не о силе режима, как может показаться на первый взгляд. Опускаясь до криминальных «наездов», власть демонстрирует свою слабость и неспособность переломить ситуацию в свою пользу в открытой борьбе. *«В этом есть и пессимистические, и оптимистические моменты*, – сказал Алексей Король. – *Оптимизм в том, что режим обречен. Но вопрос: когда?»*.

Юрий Хащеватский, в свою очередь, считает, что *«эта волна»* расправ *«пойдет и дальше»*. Цель преследуется – насадить в обществе страх. Режиссер дал для несогласных с властями *«простой»*, как он сказал, *«рецепт противоядия»*: *«Не бояться. Принципиально»*. ■

ПРОВИНЦИЯ



ПОРТРЕТ БЕЗРАБОТИЦЫ

ВАДИМ СОСНИН, ВИТЕБСК

Витебские социал-демократы из пока незарегистрированной ОСДП провели первое заседание диспут-клуба по социальным проблемам. Собрались не только партактивисты, но и пришедшие по объявлениям люди. Для обсуждения была выбрана одна из наших самых наболевших тем – безработица.

Из вступительных сообщений диспут-клуба собравшиеся обсудить витебские проблемы узнали о сложнейшем положении с рабочими местами на предприятиях бывшего ВПК, о грядущих многотысячных сокращениях на станкостроительных заводах, в электронной и легкой промышленности. Послушали и минилекцию экономиста, кандидата наук Владимира Дубовца. Но самым главным были горькие рассказы людей об их личных рабочих судьбах.

Ни одна социальная и возрастная группа у нас не чувствует себя защищенной. Бывший выпускник ПТУ рассказал, как он не получил своего первого рабочего места. На предприятиях, с которыми был заключен ученический договор, его откровенно не ждали. Работу предлагали по самому низкому разряду, зарплату обещали смешную. На нее себя не прокормишь, что уж говорить о будущей семье.

Директора предприятий не могут ежегодно обеспечивать первым рабочим местом сотни выпускников. В таком случае надо или поголовно увольнять наиболее квалифицированных работников, или безразмерно раздувать штаты со всеми вытекающими для рентабельности продукции последствиями.

Самостоятельный поиск нашему безработному витеблянину ничего не дал. В Центре занятости поставили на учет, дали список предприятий и организаций, в которых якобы имеются рабочие места. Но список оказался таким же устаревшим, как и списки многих фирм по сдаче в наем квартир. Ты приходишь, а там или уже занято, или условия кардинально изменились.

О некачественной работе «бирж труда» говорили многие. Складывается впечатление, что там больше озабочены, как направить людей на социальные работы или на уборку урожая картофеля, чем подыскать им приемлемые места работы, а тем более создать новые. Руководству Центра занятости, которое проигнорировало приглашение на диспут-клуб, наверно, было бы полезно услышать, что думают о результатах его ударного труда обивающие бюрократические пороги люди.

Многие из присутствовавших возмущались тем, что сонм государственных чиновников и работников администраций предприятий десятилетиями занимают места после ухода на пенсию, не давая продвижения молодым: *«Разве это нормально, когда 75-летний клерк умирает от дряхлости прямо за канцелярским столом?»* Вообще, в эпоху нарастающей безработицы, считают они, пенсионеры должны в обязательном порядке освобождать рабочие места.

С ними не согласны пожилые люди, которых на заседании клуба собралось достаточно много. *«Разве человек может существовать на такие пенсии? А у кого дети получают нищенскую зарплату или месяцами не видят ее вообще? И внуки без работы? Одна надежда на дедушек и бабушек»*.

Студенты и молодые выпускники вузов подняли проблему распределения. Оно должно быть адресным, для желающих. Талантливого юношу готова взять фирма, у него есть жилье, влюблен в девушку из соседнего подъезда, а тут направление в какой-нибудь отдаленный поселок Тютькино, где, в лучшем случае, можно снять угол у хозяев, получать мизерную зарплату и прозябать без каких-либо карьерных и личных перспектив. Он, естественно, отработает, если не сможет сбежать, положенный срок, но квалификация будет утрачена. И, вернувшись, начинай все сначала. Однако самое страшное, когда молодежь насильно загоняют в зону с повышенным радиационным фоном, лишая перспективы рождения здоровых детей. Ведь даже в, казалось бы, «чистом» Витебске ежедневно делается несколько операций на щитовидной железе.

Поднимается и проблема самых обездоленных – бомжей. Сами они в этот чистый зал прийти не могут. *«Сколько толковых, умных людей пропадает. Бывший офицер развелся с женой, приехал из Сибири к матери, а паспорт украли. Без него – ни квартиры, ни прописки, ни работы. И новый получить не может, пока не найдет работу и не пропишется. Власти приняли решение организовать приют, но денег нет. Наконец нашли помещение. Ремонт могли бы сделать сами нуждающиеся, только организуйте элементарную кормежку. Чтобы они днями не добывали себе пищу. А потом пропишите по этому адресу, сколько судеб будет спасено!»*

Диспут-клуб – не более чем возможность поднять проблемы. Конечно, приглашенный юрист окажет посильную помощь. Конечно, будут направлены какие-то запросы в инстанции. Но решение – за властными структурами. Жалко, что представители исполкома не нашли времени послушать людей. «Вертикаль» у нас от народа независима. ■

С ДРУГОГО БЕРЕГА

«Экономист»: Беларусь в цифрах

СЕРГЕЙ КОРОЛЬ, Филадельфия

Ежегодно журнал «Экономист» выпускает статистический сборник «Карманный мир в цифрах». Как верный подписчик (вот уже седьмой год), я получаю его бесплатно в подарок от редакции. Статистика для сборника поступает от международных организаций и всевозможных статистических агентств, в основном носит нейтральный характер или проверена по независимым источникам. Сухие, казалось бы, цифры живописуют различные страны. В том числе и Беларусь.

ПАЛЬМА ПЕРВЕНСТВА

ИНФЛЯЦИЯ. Беларусь занимает второе место в мире по уровню инфляции, который составил в 1999–2000 году 168,6% в год. На первом – Ангола (325%), на третьем – Суринам (98%), потом Эквадор (96%). В десятку лидеров попали и другие звезды мировой экономики – Зимбабве, Замбия и Гана, но даже там инфляция не превысила 60%, то есть составляет менее трети от белорусской. Из бывших советских республик с большим отставанием идет Молдова (31,2%). В России инфляция составила 20,8%, что помогает понять жесткий курс на единый эмиссионный центр.

ГЕНДЕРНЫЙ СОСТАВ. Также второе место в мире занимает Беларусь в списке наиболее женских обществ. На каждые сто женщин в Беларуси приходится всего 87 мужчин, что помогает объяснить крепкую традицию мужского шовинизма, а также необходимость на политическом горизонте партии *«Надзея»*. На первом месте в списке Латвия (86), на одном уровне с Беларусью – Эстония, Украина, чуть дальше Литва (88) и Россия (89).

Более половины всех занятых в Беларуси (53,5%) являются женщинами. На втором месте Камбоджа (52%), Украина на четвертом, Литва на пятом, на десятом – Россия, а США, самая феминистская страна в мире, занимает лишь 18 место (46,5%). Но не делайте из этого вывод, что миссия партии *«Надзея»* уже выполнена – эти цифры не принимают в учет, на каких работах заняты женщины, как оплачивается их труд, а также то, что в Беларуси они ведут домашнее хозяйство вдобавок к производственным обязанностям.

СЕМЬЯ. Еще одна серебряная медаль, второе место в мире, принадлежит Беларуси в области развода. На каждые 1000 человек приходится 4,7 развода. Ровно столько же, сколько в известных индивидуализмом США. Ироничнее всего то, что на первом месте еще один остров социализма, Куба, где на каждые тысячу человек приходится 5,7 развода. Оказывается, в личной жизни капиталисты и их ярые враги находятся на одном и том же уровне.

Кстати, Беларусь далеко не последняя и в списке стран с наивысшим процентом брака. Мы на 29 месте, на каждые 1000 человек приходится 6,9 браков, как в Австралии, и больше, чем в других республиках европейской части СССР. Значит, западная привычка жениться с тем, чтобы потом развестись, захватила и Беларусь.

ТЮРЬМЫ. Печальное третье место в мире занимает Беларусь по количеству заключенных на сто тысяч жителей. Таковых в стране приходится 577, после США (702) и России (635) – двух известных любителей решеток, которых за это постоянно критикуют правозащитники. После Беларуси следуют Казахстан (494) вместе с республиками-островами Мартиника (490), Багамы (478) и Бермуды (447). Даже на любимой нами Кубе сажают меньше – 297 на каждые сто тысяч. Примечательно, что при своем небольшом населении, Беларусь умудрилась занять 17 место по абсолютному количеству зеков – их в стране 58 879.

ТРАНСПОРТ. Беларусь является крупной железнодорожной державой, занимая третье место в мире по годовому количеству пассажиров на километр железнодорожного пути. Их насчитывается 1656. Здесь Беларусь располагается сразу после таких признанных любителей поездов, как Швейцария (1849) и Япония (1905). Франция идет со значительным отрывом на четвертом месте, Россия на восьмом, Украина на девятом.

При своей небольшой площади, Беларусь находится на 29 месте по общей длине полотна – 5,5 тысячи километров, и на 12-м по объему железнодорожных перевозок (30 370 миллионов тонно-километров). Это больше, чем Италия, Япония, Чехия и Великобритания. Понятно, почему железная дорога в Беларуси не теряет своего исключительного экономического и политического веса и особого статуса.

ЗДРАВООХРАНЕНИЕ. Как и все бывшие советские республики, Беларусь в верхних рядах списка по определенным показателям здравоохранения. Страна на четвертом месте по количеству больничных коек на 1000 человек – их в Беларуси 12,2, после Швейцарии (18,1), Японии (16,5) и Норвегии (14,7). За нами следуют Молдавия, Россия (12,1), Украина и прочие бывшие члены СССР.

Количество койко-мест само по себе не является залогом качества – большинство развитых стран занимают места в пятом десятке (3-4 койки на 1000), а лидеров списка эксперты часто критикуют за неразумно потраченные средства.

Также, по советской традиции, в Беларуси много врачей. На каждого доктора приходится всего 233 человека, это – шестое место в мире. По этому показателю на первом месте Италия с ее знаменитой социальной системой (169 человек). Еще один пример социалистической медицины – Куба, где 189 пациентов на каждого врача. Соединенные Штаты не попали в число двадцати пяти наиболее населенных врачами стран.

ЭКОНОМИКА И ЖИЗНЬ

Экономические показатели, измеряющие материальное благо в Беларуси, еще пока не самые худшие. Страна не попала в число территорий с наименьшим доходом на душу населения, в котором присутствуют в основном нищие страны Африки. В списке дохода на душу населения, пересчитанного по покупательной способности (относительно сравнительной стоимости местной корзины потребления), Беларусь занимает 60 место сверху. Этот доход составляет в Беларуси 21,6% от США, сразу после России (21,9%), и перед Бразилией (21,4%). Литва и Латвия оказались после Беларуси (около 20%).

Следует заметить, что методика подсчета, особенно в отношении зарегулированных, отрезанных от мира государственных экономик типа белорусской, не вполне совершенна. Во-первых, потому, что статистики склонны недооценивать стоимость местной корзинки. Вполне возможно, в Литве и Латвии посчитали уже по европейскому стандарту, а в Беларуси – еще по советскому. Во-вторых, стоимость жизни оказывается заниженной из-за искусственно низких государственных цен и субсидий на продукты питания.

Чуть выше положение Беларуси по индексу человеческого развития. Помимо экономики, этот индекс принимает в учет такие качества жизни, как грамотность, продолжительность жизни, среднее количество лет, проведенных в школе и т.д. Здесь Беларусь на 52 месте, набрав 78 очков из ста возможных. Результат объясняется глубоким наследием Советского Союза с его традициями образования, всеобщей грамотности и терпимым медобслуживанием.

Беларусь следует сразу за Кубой (те же причины, и если верить статистике), за ними распо-

Окончание на стр. 4 ➲

НОВОСТИ СНГ



Украіна. Магчыма, ужо да канца гэтага году ва Ўкраіне пройдуць пазачарговыя выбары ў парлямант. У першы дзень працы сэсіі Вярхоўнай рады Ўкраіны прадстаўнікі чатырох апазыцыйных фракцыяў – «Наша Ўкраіна» Віктара Юшчанкі, Сацыялістычная партыя Аляксандра Мароза, *«Батьківщина»* Юліі Цімашэнкі і Камуністычная партыя Пятра Сіманенкі – заявілі, што ня будуць прымаць удзел у паседжаньнях Вярхоўнай рады, калі тая неадкладна не разгледзіць пытаньне пра палітычную сытуацыю ў краіне. Паколькі нязначную большасьць у парляманце складаюць прыхільнікі прэзыдэнта, то ўнесьці адпаведную папраўку ў парадак дня сэсіі не ўдалося, і апазыцыйныя партыі ў поўным складзе выйшлі з залі паседжаньняў. Цяпер Вярхоўная рада ня мае канстытуцыйнага складу і ня можа працягваць сваю працу. Паводле ўкраінскай канстытуцыі, калі на працягу месяца Вярхоўная рада ня здолее сабрацца на пленарнае пасе -джаньне, прэзыдэнт абавязаны распусьціць парлямант і прызначыць дату новых выбараў.

